# Гісторыя мастацтва Беларусі

## Тэма 16.8. Жывапіс Беларусі канца 19-першай паловы 20 стагоддзя. Парыжская школа, Віцебск, Заходняя і Ўсходняя Савецкая Беларусь

Кароткі канспект па гісторыі мастацтваў Беларусі
http://art-school.by/arthistory%205-belarus2.html

**План:**

1. Рэформы мастацтва на рубяжы 19-20 стст. Уплыў французскага імпрэсіянізму. Беларускі пейзаж –творчасць Фердынанда Рушчыца, Станіслава Жукоўскага, Вітольда Беляніцкага-Бірулі.
2. Ян Кругер, Юдаль Пэн як прадстаўнікі школы рэалізму.
3. Творчасць Льва Бакста і мадэрн.
4. Мастацкая эміграцыя, прадстаўнікі Парыжскай школы - Хаім Суцін, Марк Шагал, Міхаіл Кікоін, Пінхус Крэмень, Осіп Любіч, Файбіша-Шрага (Сэм) Царфін, НадзеяХадасевіч-Лежэ.
5. Нараджэнне віцебскай авангарднай школы мастацвта, стварэнне УНОВІСа. Творчасць і дзейнасць Марка Шагала, Казіміра Малевіча, Эль Лісіцкага, Мсціслава Дабужынскага, Давіда Якерсона, Веры Ермалаевай, Саламона Юдовіна, Роберта Фалька, Уладзіміра Страмінскага.
6. Падзяленне Беларусі на Ўсходнюю і Заходнюю частку. Развіцце мастацтва у Савецкай Беларусі. Соцрэалізм. Самабытная творчасць Міхася Філіповіча, Міхаіла Станюты, Уладзіміра Кудрэвіча. Беларускі рамантызм Заходней часткі Язэпа Драздовіча, Міхася Сеўрука, Пятра Сергіевіча.

1. Жывапіс рубяжа XIX і XX стагоддзяў знамянальны рэформамі. У 1894 у Расійскай Акадэміі мастацтваў адбываецца рэформа, якая адчыніла дзверы новым плыням у мастацвте (адркрыцце персанальных майстэрняў І. Рэпіна, Ў. Макоўскага, А. Куінджы і інш. – большасць прадстаўнікі таварыства перасоўнікаў). Найбольш яскрава перамены праявіліся ў жанры пейзажа, якія распачалі французскія імпрэссіяністы і які набыў з пачатку стагоддзя вялікую папулярнасць. Вялікі ўклад у гісторыю беларускага жывапісу зрабілі ***Фердынанд Рушчыц*** (сімвалізм у пейзажы), ***Станіслаў Жукоўскі*** (майстар сядзібнага пейзажу), ***Вітольд Бялыніцкі-Біруля*** (лірычны пейзаж).





*Фердынанд Рушчыц “Зялмя”,  “Ля касцѐла”*



*Фердынанд Рушчыц “Пустэча”*







*Станіслаў Жукоўскі “Белы дом”, “Стары маѐнтак”,*


С. Жукоўскі "Кінутая тэраса"



Вітольд Бялыніцкі-Біруля "Зімовы сон", "Лясная рэчка ўзімку"


В.Бялыніцкі-Біруля "Зялены май"

2.Новы стыль у мастацтве закрануў таксама і партрэт – ***Ян Кругер***, акрамя мастацкай творчасци, адкрыў у Менску студыю малюнка, у якой першую адукацыю атрымалі будучыя сусветна знакамітыя мастакі, яшчэ раней ***Юдаль Пэн*** адкрыў першую на Беларусі прыватную школу малюнка ў Віцебску, дзе атрымалі мастацкую адукацыю сусветна вядомыя майстры.







*Якаў Кругер "Дзяўчына ў чырвоным", "Партрэт жонкі", "Партрэт Янкі Купалы"*



*Якаў Кругер "Партэт Якуба Коласа"*






*Юдаль Пэн "Стары партны", "Сапожнік"*





*Юдаль Пэн “Заўтрак” , “Аўтапартрэт з музай і смерцю”, “Партрэт Марка Шагала”.*

**3.** Асобнай старонкай стаіць творчасць ***Льва Бакста***, які нарадзіўся ў Гродна і стаў яскравым прадстаўніком мадэрну. Яго ўплыў на рускае і еўрапейскае мастацтва быў досіць суръёзны. Леў Бакст распрацоўваў дэкарацыі і касцюмы для “Рускіх сезонаў” – феерычных гастроляў рускага балета і тэатра ў Еўропе пад кіраўніцтвам Дзягілева. Наватарскія і смелыя ідэі Бакста паўплывалі нават на еўрапейскую моду.





*Леў Бакст (“Вячэра”, “Жар-птушка”, “Нарцыс”)*

4. Змены у сусветным мастацкім жыцці крануліся і Беларусі. На пачатку XX ст. рэзка ўзрасла эміграцыя з Беларусі, многія мастакі сталі сусветна вядомымі як прадстаўнікі **Парыжскай школы:** ***Хаім Суцін, Марк Шагал, Міхаіл Кікоін, Пінхус Крэмень, Осіп Любіч, Файбіша-Шрага (Сэм) Царфін, Надзея Хадасевіч-Лежэ***.




*Хаім Суцін “Туша быка”,  Марк Шагал “Шпацар”*





*М.Кікоін “Пейзаж з прачкамі”, П. Крэмень “Паляўнічы”, О.Любіч “Аўтапартэт з мадэлью”*






*Шрага Царфін “Уздож ракі”, Надзея Хадасевіч-Лежэ “Аўтапартрэт”*

5. У Віцебску ў 1918 годзе ***Маркам Шагалам*** было заснавана мастацкае вучылішча, якое стала прававеднікам новых стыляў і вядома як **віцебская школа авангарду.** Там, пад кіраўніцтвам Казіміра Малевіча, было заснавана мастацкае аб'яднанне ***УНОВІС (Утвердители НОВого Искусства - Казімір Малевіч, Эль Лісіцкі, Мсціслаў Дабужынскі, Давід Якерсон, Вера Ермалаева, Саламон Юдовін*** (графік) і інш. Віцебскае народнае вучылішча стала цэнтрам мастацкай адукацыі на Беларусі да другой сусветнай вайны. Для развіцця мадэрністычных ідэй на Беларусі і ў Польшчы шмат зрабіў і ***Уладзіслаў Стрэмінск***і, які пазней з'ехаў у Польшчу і заснаваў першы музей авангардызма ў Лодзі.






*Марк Шагал "Над горадам", "Кампазіцыя з кругам і аслом)*



*Мсціслаў Дабужынскі "Віцебск"*





*Казімір Малевіч "Супрэматызм", Эль Лісіцкі "Чырвоным клінам бі белых"*

   

*Давід Якерсон (“Панно з фігурай рабочага”, “Супрэматычная паліхромная к ампазіцыя”, “Супрэмачалавек”, “Лялькі”)*



*Вера Ермалаева “Супрыматычнае панно для ўпрыгожвання горада”*

 

*Уладзіслаў Стрэмінскі “Астатковае бачанне святла”, “Нацюрморт”*

6. Падзяленне тэрыторыі Беларусі на Усходнюю і Заходнюю сфарміравала пэўнае адрозненне ў мастацкім жыцці кожнага з рэгіёнаў. Ідэі мадэрнізму у Савецкай Беларусі спынены, усатлеўваецца жорсткія ідэалагічныя формы соцрэалізму, дзе задача мастакоў стала зводзіцца да "рэпартажнасці" падзеяў, праслаўлення савецкага ладу жыцця і савецкага кіраўніцтва. У 1927 быў зроблены першы дзяржаўны заказ на тэму "Чалавек за работай". Мастакі атрымоўвалі камандзіроўкі на прадпрыествы і вёскі на увасабленне ідэі. Самабытнасць свайго стылю захавалі ***Міхась Філіповіч, Міхаіл Станюта, Уладзімір Кудрэвіч.***






*Міхась Філіповіч “На купалле”, “Казка”, “Стары беларус”*




*Міхась Філіповіч “Бітва на Нямізе”, “Карагод”*




*Міхаіл Станюта “Партэт дачкі”, “Партрэт мастака Міхася Філіповіча”*




*Уладзімір Кудрэвіч “Раніца вясны”, “Вечар на возеры Палік*

**7.** Заходнебеларускае мастацтва, звязанае з ідэяй назыянальна-вызваленчай барацьбы, утварыла стыль "беларускага рамантызму", найбольш яркімі прадстаўнікамі якога з'яўляюцца ***Язэп Драздовіч, Міхась Сеўрук, Пётр Сергіевіч.***







*Язэп Драздовіч “Прарок”, “Жыхары Сатурна”, “Сучтрэча Вясны на Сатурне”*




*Язэп Драздовіч “Пагоня”, “Усяслаў Полацкі”*





*Міхась Сеўрук "Дзяўчаты", "Стрыжка авец"*


*Міхась Сеўрук "Жніво"*






*Пётр Сергіевіч "Шляхам жыцця", "Кастусь Каліноўскі сярод паўстанцаў ў 1863 годзе"*